**УДК [902.2+903.4/.5](476.6)** **DOI 10.52928/2070-1608-2024-71-3-9-12**

# АРХЕАЛАГІЧНЫ КОМПЛЕКС САННІКІ: ГІСТОРЫЯ І ПЕРСПЕКТЫВЫ ВЫВУЧЭННЯ

***канд. гіст. навук С.С. ЮРЭЦКІ***
***(Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі, Мінск)***
***e-mail: st.yuretski@yandex.by***

*У артыкуле разглядаюцца пытанні інтэрпрэтацыі археалагічнага комплекса Саннікі (Дзятлаўскі раён Гродзенскай вобласці). Аналізуецца гісторыя вывучэння гарадзішча Саннікі, а таксама варыянты яго інтэрпрэтацыі ў працах даследчыкаў. Прыводзяцца вынікі археалагічнага вывучэння, якія праводзіў аўтар. На падставе аналіза новых крыніц абгрунтоўваецца вылучэнне археалагічнага комплекса Саннікі.*

***Ключавыя словы:*** *археалогія Беларусі, Старажытная Русь, Вялікае Княства Літоўскае, пахавальная абраднасць, язычніцтва, балты, славяне.*

**Уводзіны.** У Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь пад шыфрам 413В000254 пазначана гарадзішча Саннікі [1, с. 371]. Дадзенае гарадзішча размешчана ў Дзятлаўскім раёне Гродзенскай вобласці. Помнік лакалізаваны ў 250 м на поўнач ад населенага пункта Саннікі на правым беразе р. Лядзінка паміж населенымі пунктамі Саннікі і Раготна (GPS: 53.338169, 25.487204). Цікавасць да дадзенага помніка археалогіі праяўлялі даследчыкі з канца XIX ст. У выніку інфармацыя аб ім увайшла ў навуковую і энцыклапедычную літаратуру [2, с. 140; 3, с. 277]. Палявыя даследаванні, праведзеныя аўтарам у 2021 і 2023 гг., адкрылі новыя даныя, якія дазволілі інтэрпрэтаваць помнік археалогіі Саннікі ў якасці археалагічнага комплекса, які складаецца з гарадзішча, селішча і грунтовага могільніка [4].

Мэтай дадзенага артыкула з’яўляецца аналіз гісторыі вывучэння помніка Саннікі, аргументацыі яго інтэрпрэтацыі ў якасці археалагічнага комплекса X–XVI стст., а таксама вызначэння перспектыўных накірункаў яго далейшага даследавання. Актуальнасць пазначанай тэматыкі тлумачыцца як перспектыўнасцю вывучэння матэрыяльнай культуры і аб’ектаў, звязаных з сельскім насельніцтвам старажытнарускага часу і перыяду Вялікага Княства Літоўскага, так і самім рэгіёнам даследавання. Менавіта тэрыторыя Верхняга Панямоння, і асабліва яго паўднёвая частка, дзе знаходзіцца археалагічны комплекс Саннікі, з’яўляецца надзвычай важнай для вызначэння складаных этнакультурных працэсаў. Тых працэсаў, якія звязаны са славянскай каланізацыяй, станаўленнем структур старажытнарускага часу і фарміраваннем новага дзяржаўнага ўтварэння – Вялікага Княства Літоўскага.

**Першыя звесткі.** Упершыню сведчанні аб гарадзішчы Саннікі былі змешчаны ў працы Ф.В. Пакроўскага «Археологическая карта Гродненской губернии» (1895 г.). Даследчыкам на тэрыторыі Рагатнянскай воласці Слонімскага павета адзначана: *“Въ 100 саженяхъ отъ д. Санюковъ, на холмѣ, сохраняется круглая земляная насыпь, величиною около 15 саж. Въ діаметрѣ и до одной сажени вышины – по откосу; называется «Талерка». На ней прежде находимы были золотыя и серебряныя монеты. Теперь и холмъ и пасыпь поросли мужжавельникомъ, тѣмъ не менѣе и до сихъ поръ можно наблюдать на самой насыпи слѣды дѣятельности человѣка, въ формѣ, повидимому, чего-то сходнаго съ полевыми запашками, а на холмѣ – слѣды кладбища. – Народ вѣрит, что на насыпи прежде стояла церковь, которая впослѣдствіи ушла въ землю”* [5, с. 14].

У прыведзенай цытаце звяртае на сябе ўвагу не толькі лакалізацыя і агульнае апісанне помніка. Надзвычай важным з’яўляюцца сведчанні аб слядах могілак на тэрыторыі ўзвышша, на якім знаходзіцца гарадзішча, а таксама слядоў гаспадарчай дзейнасці мясцовага насельніцтва. Менавіта дадзеныя факты дазваляць тлумачыць вынікі вывучэння адкрытага аўтарам грунтовага могільніка, пра што будзе пазначана ніжэй.

**Матэрыялы першых археалагічных абследаванняў.** Далейшыя даследаванні гарадзішча Саннікі адносяцца да часу пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны. У 1959 г. помнік абследаваў ленінградскі археолаг, буйны спецыяліст па старажытнарускаму абарончаму дойлідству і архітэктуры П.А. Рапапорт. Археолагам было зроблена апісанне помніка. Звярталася ўвага на яго размяшчэнне на халме вышынёй каля 12 м, а таксама на правільную форму самога гарадзішча і яго памеры з дыяметрам па пляцоўцы 34 м [6, с. 10]. П.А. Рапапорт зняў план гарадзішча, які стаў у пэўнай ступені ўзорам для прац пазнейшых даследчыкаў. Археолаг адзначыў адсутнасць слядоў культурнага слоя на плошчы помніка і сляды падрэзкі схілаў халма ў аснаванні гарадзішча. Значнай з’яўляецца фіксацыя археолагам фрагментаў керамікі XI ст. на полі, якое прымыкала з усходняга боку да гарадзішча [6, с. 11].

Інфармацыя, якая была назапашана П. А. Рапапортам, была прыведзена яшчэ адным ленінградскім археолагам Ф.Д. Гурэвіч у яе манаграфіі «Древности Белорусского Понеманья» (1962 г.) [7, с. 203]. Неабходна падкрэсліць, што ў паказальніку помнікаў пад назвай “Санюкі” ёю адзначана гарадзішча і селішча з храналагічным вызначэннем абодвух XI–XIII стст. [7, с. 219].

У 1974 г. помнік абследавала экспедыцыя Інстытута гісторыі АН БССР пад кіраўніцтвам П.Ф. Лысенкі. Археолагам у справаздачы па выніках палявых работ прыведзена апісанне самога гарадзішча, размешчанага на “*отдельном моренном останце*”. П.Ф. Лысенка адзначыў таксама звесткі пра слаба заўважны вал вышынёй 20–30 см па перыметры пляцоўкі [8, с. 10].

Дадзеныя звесткі ўцэлым былі паўтораны ў выданні «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобласць» (1986 г.) [9, с. 180]. Адзначым аднак два моманты. Па першае, у ім цалкам адсутнічаюць звесткі пра сляды селішча каля гарадзішча. Дадзеная акалічнасць будзе характэрная і для некаторых пазнейшых выданняў [3, с. 277]. Па другое, у публікацыі згадваецца абследаванне помніка Ф.Д. Гурэвіч у 1955 г. Пры гэтым, у навуковай справаздачы дадзенай даследчыцы па выніках палявых даследаванняў 1955 г. пазначана: *"Близ деревни (Саннікі – прым. С.Ю.) на холме расположено городище. Ввиду карантина осмотреть его не удалось"* [10, с. 27–28].

Важным вынікам першых археалагічных абследаванняў помніка стала яго дакладная прасторавая фіксацыя, а таксама лакалізацыя з усходняга боку гарадзішча селішча з керамічнымі матэрыяламі старажытнарускага часу.

**Гарадзішча-сховішча альбо гарадзішча-свяцілішча.** Пытанні класіфікацыі гарадзішча і інтэрпрэтацыі помніка Саннікі таксама пачалі разглядацца ў шэрагу даследаванняў. Вызначэнне месца гарадзішча сярод сінхронных аб'ектаў зрабіў П.А. Рапапорт у манаграфіі «Военное зодчество западнорусских земель X–XIV вв.» (1967 г.). Гарадзішча было аднесена археолагам да тыпу ўмацаванняў, якія мелі геаметрычна правільныя формы, што не былі прывязаныя да ландшафту. Адметнай з'яўляецца таксама прыведзеная датыроўка керамікі з селішча, што прымыкае да гарадзішча – X–XI стст. [11, с. 83]. Я.Г. Зверуга ў сваёй абагульняючай працы «Верхнее Понеманье в IX–XIII вв.» (1989 г.) аднёс помнік Саннікі да ліку гарадзішчаў, форма якіх не залежыць ад канфігурацыі мясцовасці. Даследчык звярнуў увагу на наяўнасць у непасрэднай блізасці селішча, насельніцтва якога падчас небяспекі магло знайсці прытулак на гарадзішчы [12, с. 96]. Гарадзішча Саннікі разгледзеў у сваіх даследаваннях і С.А. Піваварчык. Першапачаткова даследчык з улікам адсутнасці культурнага слоя, а таксама наяўнасці ў непасрэднай блізасці ад яго селішча, аднёс Саннікі да тыпу помнікаў *"гарадзішчы-сховішчы"* [13, с. 105]. У далейшым, у адпаведнасці з сацыяльна-гістарычнай тыпалогіяй, якую выпрацаваў археолаг для гарадзішчаў Беларускага Панямоння X–XIII стст., Саннікі былі аднесены да тыпу *"гарадзішчы-сховішчы і гарадзішчы-свяцілішчы"*. Прыметай аднясення да дадзенага тыпу з'явілася адсутнасць культурнага слоя на пляцоўцы, а таксама натуральная абароненасць месцазнаходжання гарадзішча [14, с. 22]. Пры гэтым, у сваім дысертацыйным даследаваннні С.А. Піваварчык разглядаў гарадзішча Саннікі ўжо якасці гарадзішча-свяцілішча [15, с. 162].

Даволі цікавыя звесткі аб гарадзішчы Саннікі змешчаны П.А. Русавым у навукова-папулярным выданні «Спатканыя ў дарозе» (1995 г.). У дадзеным выданні гарадзішча інтэрпрэтуецца як гарадзішча-свяцілішча. На карысць гэтаму прыводзяцца мясцовыя паданні і невялікія памеры гарадзішча [16, с. 31–33]. Аўтарам прыведзены таксама варыянт графічнай рэканструкцыі гарадзішча-свяцілішча. Гарадзішча Саннікі як помнік перыяду славянскай каланізацыі рэгіёна ў X–XII стст. разглядаў В.У. Шаблюк. Пры гэтым звярталася ўвага на выкарыстанне гарадзішча тагачасным мясцовым насельніцтвам у якасці сховішча [17, с. 25–26].

Археолагам, які правёў значныя даследаванні на гарадзішчы Саннікі стаў Э.М. Зайкоўскі. Менавіта ён у 1997 г. здзейсніў на пляцоўцы гарадзішча раскопкі плошчай 120 м$^2$ [2; 3; 18; 19]. Даследчык па выніках праведзеных прац адзначыў наяўнасць культурнага пласта каля края пляцоўкі глыбінёй да 1,15 м. Пры гэтым у цэнтры пляцоўкі такі пласт фіксаваўся магутнасцю да 0,25 м. У культурным пласце даследчыкам былі зафіксаваны парэшткі драўніны, а таксама вуголля. Сярод ідэнтыфікаваных артэфактаў быў знойдзены фрагмент венца кружальнай керамікі, які можа быць храналагічна аднесены да XVI ст. [19, с. 36]. Э.М. Зайкоўскі па выніках сваіх прац быў схільны разглядаць гарадзішча Саннікі ў якасці паганскага свяцілішча. Пры гэтым час яго функцыянавання адносіў да позняга Сярэднявечча, звязваючы з мясцовым неславянскім насельніцтвам [2, с. 140].

Да высноў аб сакральным прызначэнні дадзенага месца прыйшлі Л.У. Дучыц і І.Я. Клімовіч. На карысць існавання тут паганскага капішча прыводзяцца мясцовыя паданні пра ўзгорак – *"гару Талерка"* [20, с. 179; 21, с. 11]. У якасці сакральнага месца дадзенае ўзвышша разглядаецца і ў пазнейшых абагульняючых працах [21, с. 81]. А.С. Кібінь таксама схіляецца да высновы аб верагоднай ступені ідэнтыфікацыі падобных гарадзішчаў Верхняга Панямоння ў якасці свяцілішчаў. Цікавым падаецца погляд даследчыка наконт *"символического"* прызначэння такіх гарадзішчаў [22, с. 27].

Такім чынам, у шэрагу абагульняючых даследаванняў ужо разгледжаны пытанні класіфікацыі і інтэрпрэтацыі гарадзішча Саннікі. Шэрагам навукоўцаў звернута ўвага на яго верагоднае атаясамленне з гарадзішчам-сховішчам, альбо гарадзішчам-свяцілішчам. Пры гэтым, частка даследчыкаў звязвала яго функцыянаванне са старажытнарускім часам з улікам размяшчэння паблізу селішча дадзенага перыяду (П.А. Рапапорт, Я.Г. Зверуга, С.А. Піваварчык). Э.М. Зайкоўскі па выніках вывучэння пляцоўкі гарадзішча аднёс яго да познесярэднявечнага часу.

**Археалагічны комплекс.** Аўтарам у 2021 г. было праведзена даследаванне помніка Саннікі, а таксама прылеглай да яго тэрыторыі. У выніку правядзення паверхневых збораў, а таксама раскопак плошчай 42 м$^2$ на тэрыторыі ўзвышша, на якой знаходзіцца гарадзішча, былі атрыманы новыя даныя, якія дазваляюць унесці істотныя карэктывы ў існуючую інтэрпрэтацыю помніка Саннікі.

Па-першае, на тэрыторыі, якая прымыкае да ўзвышша (не толькі з заходняга, але і з паўднёвага і ўсходняга бакоў), было лакалізавана селішча старажытнарускага перыяду. У выніку правядзення паверхневых збораў на тэрыторыі ўзворвання былі знойдзены фрагмент бронзавага бранзалета, бронзавыя бляшкі (накладкі) пасавыя, фрагменты керамічнага посуду. Выяўленыя на селішчы матэрыялы звязваюцца са старажытнарускім насельніцтвам і могуць быць датаваны X–XIII стст.

Па-другое, на тэрыторыі ўзвышша, на якім знаходзіцца гарадзішча, быў выяўлены грунтовы могільнік. На ўскрытай раскопкамі плошчы 42 м$^2$ было выяўлена 10 грунтовых пахаванняў па абрадзе інгумацыі. Большая частка з выяўленых аб'ектаў разбурана з-за сельскагаспадарчай дзейнасці на тэрыторыі ўзвышша (паверхневыя зборы

дазволілі выявіць жалезны наканечнік дзіды і сякеру, крэсіва, спражку і фрагмент пярсцёнка). У трох пахаваннях выяўлены выразны пахавальны інвентар. У мужчынскім пахаванні (раскоп 1, аб'ект 1) былі знойдзены пенязі Вітаўта (калюмны/дзіда з крыжом), нож, крэсіва, спражка пасавая і сякера з пашкоджаным лязом, якая знаходзілася ў нагах пахаванага. Па прыметах развіцця шкілета ўзрост памерлага вызначаны ў дыяпазоне 12–14 год. У жаночым пахаванні (раскоп 1, аб'ект 2) пахавальны інвентар быў прадстаўлены наступнымі артэфактамі: бронзавая фібула – сакта (знаходзілася на правай ключыцы ў раёне грудзіны), бронзавыя пярсцёнкі, з іх адзін захаваны цалкам на левай руцэ і адзін фрагментарна, жалезны нож (знаходзіўся злева каля вобласці таза), 2 бронзавыя накладкі, з якіх 1 гузік (?) (знаходзіліся ў раёне грудной клеткі), 3 фрагменты кружальнай керамікі (1 фрагмент знаходзіўся ў раёне таза, два іншыя – каля ніжняй костцы правай нагі). Па ступені сцёртасці зубоў узрост пахаванай вызначаны ў дыяпазоне 18–20 год. У наступным жаночым пахаванні (раскоп 1, аб'ект 4) былі знойдзены пытаннепадобныя завушніцы і пярсцёнак. Узрост памерлай вызначаны ў дыяпазоне каля 18–20 год. Астатняя частка пахаванняў не мела пахавальнага інвентара, або пашкоджаны характар аб'ектаў не дазволіў выявіць такія артэфакты.

Характар вывучаных пахаванняў дазваляе звязваць іх з балцкім насельніцтвам і датаваць XIV–XVI стст. Адметнасці пахавальнай абраднасці маюць аналогіі ў матэрыялах балцкіх грунтовых могільнікаў XIV–XVI стст. на тэрыторыі сучаснай Літвы на ўсход ад Каунаса – напрыклад могільніка Румшышкес [23, рav. 1; 12: 1–3; 13: 2, 3].

У выніку на падставе атрыманых новых даных неабходна інтэрпрэтаваць помнік Саннікі ў кантэксце археалагічнага комплексу, які ўключае ў сябе гарадзішча, селішча і грунтовы могільнік. На сённяшнім этапе даследаванняў археалагічны комплекс Саннікі датуецца X–XVI стст.

**Перспектывы далейшага вывучэння.** Археалагічны комплекс Саннікі мае важнае значэнне для даследавання гістарычных працэсаў, якія праходзілі на тэрыторыі Верхняга Панямоння ў перыяд Сярэднявечча. На сённяшнім этапе вывучэння мы можам казаць аб двух асноўных этапах у гісторыі функцыянавання комплекса.

Першы этап звязваецца са старажытнарускім часам і датуецца X–XIII стст. адпаведна знаходкам з тэрыторыі селішча. Знаходкі дадзенага часу (паясныя накладкі) зафіксаваны і на тэрыторыі ўзвышша. Пры гэтым неабходна зрабіць заўвагу, што вызначальных знаходак перыяду Старажытнай Русі на тэрыторыі самога гарадзішча пакуль не выяўлена. Аднак, з вялікай доляй упэўненасці можна казаць аб часе з'яўлення гарадзішча адначасова з селішчам і звязаць дадзеную падзею са славянскай каланізацыяй рэгіёна. На карысць дадзенага сцвярджэння сведчыць наяўнасць падобных гарадзішчаў без культурнага слоя ў межах асваення славянамі тэрыторый [24, 1993, с. 20–24]. З улікам правільнай геаметрычнай формы круга гарадзішча неабходна разглядаць у якасці культавага аб'екта. На карысць гэтаму сведчыць малая плошча пляцоўкі (34 м у дыяметры), якая рабіла нязручным сховішча значнай колькасці людзей і маёмасці. Круглая форма ў якасці сакральнай шырока вядомая сярод аналогій культавых аб'ектаў [25, с. 18–19].

Пытаннем для далейшага вывучэння з'яўляецца, безумоўна, высвятленне больш дакладнага часу і адметнасцей узвядзення гарадзішча. Для яго вызначэння ў будучым неабходна правесці прарэзку вала. Выразных сведчанняў культавых пабудоў альбо падобных ім аб'ектаў пакуль не выяўлена на пляцоўцы гарадзішча. Таму перспектыўным застаецца даследаванне і самой пляцоўкі. Мэтазгодным з'яўляецца і далейшае вывучэнне селішча, што на дадзены момант знаходзіцца пад ворывам. Таксама неабходна правесці больш грунтоўную разведку ў наваколлі з мэтай пошуку селішчаў старажытнарускага часу. Характар гарадзішча сведчыць пра яго даволі значны статус для тагачаснага мясцовага насельніцтва. Высветліць трэба колькасць селішчаў у наваколлі, насельніцтва якіх гіпатэтычна магло выкарыстоўваць дадзены культавы аб'ект.

Вынікі даследавання грунтовага могільніка паказалі наяўнасць тут балцкага (літоўскага) насельніцтва. На сённяшні дзень пахаванні датуюцца XIV–XVI стст. Неабходна далейшае і суцэльнае вывучэнне могільніка. Адным з найбольш важных пытанняў застаецца пошук магчымых больш ранніх балцкіх пахаванняў (перадусім, па абрадзе крэмацыі). У выніку іх адсутнасці і на падставе сучасных даных можна сцвярджаць пра з'яўленне тут балцкага насельніцтва ў XIV ст. Дадзеныя факты пры далейшым комплексным вывучэнні могуць унесці і пэўныя карэктывы адносна часу з'яўлення балтамоўнага насельніцтва на тэрыторыі Дзятлаўшчыны.

Адным з пытанняў для далейшага даследавання з'яўляецца і выкарыстанне гарадзішча ў якасці культавага аб'екта ў XIV–XVI стст., а магчыма і ў пазнейшы час. Прынамсці, ажно па сённяшнія дні мясцовае насельніцтва выкарыстоўвае пляцоўку гарадзішча падчас палення кастрышча на Купалле.

**Высновы.** Гарадзішча Саннікі, вядомае ў навуковай літаратуры з канца XIX ст., стала аб'ектам абследавання археолагамі з 1950-х гг. У гістарыяграфіі прадстаўлены погляды на яго як на гарадзішча-сховішча альбо гарадзішча-свяцілішча. Храналогія яго функцыянавання таксама вызначалася па-рознаму: старажытнарускі час (П.А. Рапапорт, П.А. Піваварчык, А.С. Кібінь і інш.), альбо Позняе Сярэднявечча (Э.М. Зайкоўскі).

Даследаванні, праведзеныя аўтарам, дазволілі вылучыць тут археалагічны комплекс Саннікі, які складаецца з селішча, гарадзішча і грунтовага могільніка. Селішча датуецца X–XIII стст. і звязваецца са старажытнарускім насельніцтвам. Грунтовы могільнік адносіцца да балцкага (літоўскага) насельніцтва XIV–XVI стст. Пры гэтым, гарадзішча, што было ўзведзена ў старажытнарускі час, магло выкарыстоўвацца ў культавых мэтах і насельніцтвам, якое пакінула пасля сябе могільнік.

Перспектыўнымі застаюцца даследаванні як асобных складнікаў археалагічнага комплекса (селішча, гарадзішча і могільніка), так і іх узаемасувязі паміж сабой. На сённяшнім этапе даследаванняў археалагічны комплекс Саннікі датуецца X–XVI стст.

ЛІТАРАТУРА


1. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь: [давед.] / склад.: В.Я. Абламскі, І.М. Чарняўскі, Ю.А. Барысюк. – Мінск: БЕЛТА, 2009. – 684 с.
2. Зайкоўскі Э.М. Познесярэдневяковыя язычніцкія свяцілішчы і культавыя аб'екты // Археалогія Беларусі: у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі; рэдкал.: М. С. Сташкевіч (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2001. – Т. 4: Помнікі XIV–XVIII стст. / Ш.І. Бекцінееў, Ю.М. Бохан, І.У. Ганецкая [і інш.]. – С. 139–248.
3. Зайкоўскі Э.М. Саннікі // Археалогія Беларусі: энцыклапедыя: у 2 т. / склад. Ю.У. Каласоўскі; рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2011. – Т. 2: Л–Ю. – С. 277.
4. Юрецкий С.С. Археологический комплекс Санники в Верхнем Понеманье // Второй республиканский форум молодых ученых учреждений высшего образования Республики Беларусь: сб. науч. тр. / Белорус.-Рос. ун-т; редкол.: В.М. Пашкевич (общ. ред.) [и др.]. – Могилев, 2023. – С. 121–122.
5. Покровский Ф.В. Археологическая карта Гродненской губернии. – Вильна: Тип. А. Г. Сыркина, 1895. – 165 с.
6. Раппопорт П.А. О полевой работе 1959 г. в Гродненской и Брестской областях БССР // Центральный научный архив НАН Беларуси (ЦНА НАН Беларуси). – Ф. – Оп. 1. – Арх. № 59.
7. Гуревич Ф.Д. Древности Белорусского Понеманья. – М.; Л.: Изд-во Акад. наук СССР, 1962. – 222 с.
8. Лысенко П.Ф. Отчет о полевых исследованиях Туровского археологического отряда в 1974 году // ЦНА НАН Беларуси. – Ф. – Оп. 1. – Арх. № 474.
9. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобласць / Акад. навук БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэдкал.: С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларус. Сав. Энцыкл., 1986. – 369 с.
10. Гуревич Ф.Д. Отчет о работе славяно-литовского отряда Прибалтийской экспедиции за 1955 г. // ЦНА НАН Беларуси. – Ф. – Оп. 1. – Арх. № 11.
11. Раппопорт П.А. Военное зодчество западнорусских земель X–XIV вв. – Л.: Наука, Ленингр. отд-ние. – 240 с.
12. Зверуго Я.Г. Верхнее Понеманье в IX–XIII вв. – Мінск: Навука і тэхніка, 1989. – 207 с.
13. Піваварчык С.А. Сацыяльна-гістарычная тыпалогія гарадзішч Панямоння X–XIII стст. // Гіст.-археал. зб.: у 2 ч. / Ін-т гісторыі АН Беларусі. – Мінск, 1993. – Ч. 2: Памяці Міхася Ткачова. – С. 93–108.
14. Пивоварчик С.А. Городища X–XIII вв. Белорусского Понеманья: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.06. – Минск, 1994. – 26 с.
15. Пивоварчик С.А. Городища X–XIII вв. Белорусского Понеманья: дис. ... канд. ист. наук: 07.00.06. – Минск, 1994. – 253 л.
16. Русаў П.А. Спатканыя ў дарозе. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – 53 с.
17. Памяць. Дзятлаўскі раён: гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі / рэдкал.: П.М. Бараноўскі [і інш.]. – Мінск: Універсітэцкае, 1997. – 397 с.
18. Зайкоўскі Э.М. Справаздача пра палявыя археалагічныя даследаванні ў 1997 г. // ЦНА НАН Беларусі. – Ф. – Воп. 1. – Арх. № 1678.
19. Зайкоўскі Э. Язычніцкія свяцілішчы паўночнай перыферыі ўплываў галіцка-валынскага княства // Галич и Галицька земля в державотворчих процесах України: Матеріали Міжнар. ювіл. наук. конф. / НАН України, Прикарпат. ун-т; ред. В. Кононенко [та ін.]. – Івано-Франківськ ; Галич, 1998. – С. 33–37.
20. Дучыц Л., Клімковіч І. Узгоркі, апетыя ў міфах і паданнях // Полымя. – 2010. – № 10. – С. 177–188.
21. Сакральныя ўзгоркі Беларусі / В.Ф. Вінакураў, Л.У. Дучыц, Э.М. Зайкоўскі [і інш.]. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2022. – 267 с.
22. Кибинь А.С. От Ятвязи до Литвы: русское пограничье с ятвягами и Литвой в X–XIII века. – 2-е изд. – М.: Квадрига, 2022. – 269 с.
23. Urbanavičius V. Rumšiškėnai XIV–XVI amžiais = Население Румшишкес в XIV–XVI вв. – Vilnius: [s. n.], 1970. – 81 p.
24. Русанова И.П., Тимощук Б.А. Языческие святилища древних славян. – М.: [б. и.], 1993. – 144 с.
25. Русанова И.П. Истоки славянского язычества: культовые сооружения Центральной и Восточной Европы в I тыс. до н.э. – I тыс. н.э. – Черновцы: Прут, 2002. – 172 с.


*Паступіў 18.04.2024*

## АРХЕОЛОГИЧЕСКИЙ КОМПЛЕКС САННИКИ: ИСТОРИЯ И ПЕРСПЕКТИВЫ ИЗУЧЕНИЯ

***канд. ист. наук С.С. ЮРЕЦКИЙ***
***(Центральная научная библиотека имени Якуба Коласа НАН Беларуси, Минск)***

*В статье рассматриваются вопросы интерпретации археологического комплекса Санники (Дятловский район Гродненской области). Анализируется история изучения городища Санники, а также варианты его интерпретации в работах исследователей. Приводятся выводы археологического изучения, проводимого автором. На базе анализа новых источников обосновывается выделение археологического комплекса Санники.*

***Ключевые слова:*** *археология Беларуси, Древняя Русь, Великое княжество Литовское, погребальная обрядность, язычество, балты, славяне.*

## SANNIKI ARCHAEOLOGICAL COMPLEX: HISTORY AND STUDY PROSPECTS

***S. YURETSKI***
***(The Yakub Kolas Central Scientific Library of National Academy of Sciences of Belarus, Minsk)***

*This article deals with the issues of interpretation of the archaeological complex of Sanniki (Dzaytlava district, Grodno Region). The history of the study of Sanniki settlement is analysed, as well as its interpretation options in the works of researches. The results of the archaeological study conducted by the author are given.Based on analyses of new sourses, the selection of the Sanniki archaeological complex is justified.*

***Keywords:*** *archaeology of Belarus, Ancient Rus, Grand Duchy of Lithuania, funeral rites, paganism, Balts, Slavs.*